WWW.BAJ.BY

Беларуская асацыяцыя журналістаў

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

СМІ Ў БЕЛАРУСІ

№ 1 (63) 2021



Фото: BelsatTVsmart

ВЫНІКІ МЕДЫЙНАГА ГОДА

2020 год аказаўся для беларускіх медыяў найцяжэйшым за ўвесь час маніторынгу становішча ў сферы СМІ. Колькасць атакаў на журналістаў, блогераў і СМІ рэзка ўзрасла. Улады спрабавалі процідзейнічаць распаўсюду інфармацыі пра COVID-19 у краіне, а таксама пра палітычны і прававы крызіс, звязаны з прэзідэнцкімі выбарамі.

Беларусь аказалася адной з нешматлікіх еўрапейскіх краінаў, у якіх не быў абвешчаны каранцін у сувязі з COVID-19, і, больш за тое, афіцыйныя асобы доўгі час наогул адмаўлялі сур’ёзнасць гэтага захворвання. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка доўгі час называў пандэмію «псіхозам» і «інфадэміяй» і заклікаў Міністэрства інфармацыі і сілавыя структуры змагацца з распаўсюдам «хайпу» на тэму каронавіруса. Міністэрства аховы здароўя не надавала журналістам і грамадству аператыўнай і дакладнай інфармацыі пра распаўсюд COVID-19 у краіне.




Падрабязней пра ўплыў становішча з каронавірусам на дзейнасць журналістаў і СМІ гл.
https://baj.by/be/analytics/masmedyya-u-belarusi-no2-61-2020-smi-belarusi-padchas-karanavirusa

Абсалютная большасць нападаў на журналістаў і медыі ў 2020 годзе былі звязаныя з асвятленнем імі выбараў, якія адбыліся ў жніўні, і акцыяў пратэсту, якія прайшлі пасля іх. У 95% выпадкаў «агрэсарамі» выступалі прадстаўнікі ўлады (супрацоўнікі сілавых структураў, пасадовыя асобы і г.д.). Найбольш масавым тыпам парушэння правоў журналістаў былі іх затрыманні. БАЖ зафіксаваў 481 затрыманне за год, што больш як у два разы, чым за папярэднія шэсць гадоў, разам узятыя. Папярэднім «пікавым» годам быў поствыбарчы 2011 год, калі журналістаў затрымоўвалі 167 разоў. Амаль столькі ж журналістаў было затрымана толькі ў жніўні 2020 года – 160 асобаў.



Фота: pixabay.com/

Затрыманні журналістаў




Затрыманні і арышты журналістаў часцяком суправаджаліся пашкоджаннем і канфіскацыяй прафесійнай тэхнікі, выдаленнем адзнятых матэрыялаў, гвалтам.

У Мінску былі зафіксаваныя тры выпадкі застасавання агнястрэльнай зброі ў адносінах да журналістак падчас іх працы на акцыях пратэсту, у выніку чаго яны атрымалі раненні. Гэтак, 10 жніўня журналістка «Нашай Нівы» Наталля Лубнеўская была параненая гумовай куляй, калі адзін з супрацоўнікаў праваахоўных органаў спыніўся ў 10 метрах ад групы журналістаў у камізэльках «Прэса» і стрэліў журналістцы ў нагу ў момант, калі яна здымала падзеі. Лячэнне ў шпіталі заняло больш за месяц.

Павялічылася колькасць крымінальных справаў, якія былі ўзбуджаныя супраць журналістаў і медыяспецыялістаў. За год крымінальны пераслед зазналі 15 прадстаўнікоў медыяў, 9 з якіх да пачатку 2021 года заставаліся за кратамі. Найбольшы розгалас атрымалі крымінальныя справы супраць журналістак

тэлеканала «Белсат» Кацярыны Андрэевай і Дар'і Чульцовай за правядзенне стрыму з масавай акцыі (яны былі абвінавачаны ў арганізацыі масавых пратэстаў), а таксама журналісткі партала TUT.by Кацярыны Барысевіч нібыта за разгалошванне ўрачэбнай таямніцы (яна паведаміла нададзеную лекарам інфармацыю пра тое, што ў крыві загінулага пратэстоўца, насуперак завярэнням уладаў, не было алкаголю).


Журналісткі Кацярына Андрэева, Дар'я Чульцова і Кацярына Барысевіч

Напрыканцы года была ўзбуджаная крымінальная справа супраць медыяменеджараў і журналістаў «Прэс-клуба», а таксама супраць былой журналісткі дзяржаўнай Белтэлерадыёкампаніі Ксеніі Луцкінай, якая звольнілася пасля выбараў, з нагоды інкрымінаванага ім парушэння падатковага заканадаўства.

Звяртае на сябе ўвагу сістэмнасць ціску ўладаў ва ўсіх сферах, звязаных з медыямі, з застасаваннем разнастайных рэпрэсіўных захадаў. Акрамя ўжо пералічаных, гэта:

блакаванне ў Беларусі інтэрнэту ў першыя дні пасля выбараў і пастаянныя абмежаванні мабільнага інтэрнэту падчас масавых акцыяў пратэсту;

- **абмежаванне доступу да сайтаў, якія незалежна асвятляюць палітычную сітуацыю;**
- **пазбаўленне статусу СМІ найбуйнейшага ў Беларусі інтэрнэт-партала TUT.BY;**
- **ціск на папулярныя Telegram- і Youtube-каналы, а таксама лакальныя чаты (ад узбуджэння крымінальных справаў, праследу адміністратараў, да абвяшчэння іх экстрэмісцкімі матэрыяламі);**
- **стварэнне перашкодаў для друку і распаўсюду некалькіх недзяржаўных газетаў, што спрычыніла спыненне іх выпуску;**
- **адмовы ў акрэдытацыі замежным карэспандэнтам і наступнае пазбаўленне акрэдытацыі ўсіх карэспандэнтаў замежных СМІ, якія мелі яе раней;**
- **звальненні і праслед журналістаў дзяржаўных СМІ, якія выступілі супраць распаўсюду няпраўдзівай прапагандысцкай інфармацыі.**

Больш падрабязна пра ціск на медыі падчас выбараў і ў поствыбарчы перыяд гл. https://baj.by/be/analytics/elektronny-byuleten-smi-u-belarusi-no3-2020-cmi-padchas-vybarau-i-u-postvybarchy-peryyad

ЛІЧБЫ ГОДА

9

прадстаўнікоў медыя — у СІЗА па крымінальных справах

477

затрыманняў журналістаў

97

разоў журналісты адбывалі адміністрацыйны арышт

усяго

15

прадстаўнікоў медыя пад крымінальным пераследам

не менш за

62

журналісты пацярпелі ад гвалту з боку сілавікоў

больш за

1 200

дзён журналісты правялі агулам за кратамі

Колькасць затрыманняў журналістаў па месяцах:



4

газеты вымушаны былі прыпыніць выхад

больш за

50

грамадска-палітычным сайтам і сайтам медыя быў абмежаваны доступ

59 891

BYN агульная сума штрафаў журналістам і медыя

Беларуская асацыяцыя журналістаў | www.baj.by

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Выдавец:
ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
БЕЛАРУСЬ, 220004, Мінск,
вул. Кальварыйская, 16-265

Тэл.: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
E-mail: press@baj.by
Web: www.baj.by

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч,
старшыня ГА «БАЖ»

2021